професcионального развития студентов и являются необходимым условием успешной профессиональной деятельности специалиста-выпускника.


**ЛИТЕРАТУРА**

1. Воронов, Д. В. Профессия ветеринарного врача: не все так просто!.. / Д. В. Воронов. – Наше сельское хозяйство. – № 7. – 2014. – С. 19-21.
2. Чуркин, С. Д. Профессиональная направленность и карьерные ориентации студентов различных факультетов / С. Д. Чуркин, Т. Д. Дубовицкая, Е. Б. Маслов // Современные проблемы науки и образования. – 2012. – № 2; [Электронный ресурс]. – Режим доступа: www.science-education.ru/102-5882. – Дата доступа: 25.09.2014.
3. Шишенко, Г. А. Педагогические условия формирования профессиональной направленности студентов колледжа физической культуры: дисс... канд. пед. наук / Г. А. Шишенко. – Екатеринбург, 1998. – 149 с.



УДК 357. 23 (091) “1913” (476.6)


# АГРАНАМІЧНЫ ПЕРСАНАЛ ГАРАДЗЕНСКАЙ ГУБЕРНІ ПА СТАНЕ НА 1913 Г.


**Галубовіч В. У.**
УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь


Пачатак адносна сістэмнай дзейнасці дзяржаўных структур Расійскай імперыі ў галіне развіцця сельскай гаспадаркі ў Гарадзенскай губерні выпадае на канец першага дзесяцігоддзя ХХ стагоддзя. У гэтым накірунку адной з галоўных задач было фармаванне штату спецыялістаў, якія б маглі аказваць прафесійную дапамогу сялянам. На падбор кадраў і арганізацыя іх працы ў адпаведным накірунку спатрэбілася некалькі гадоў.

Паводле справаздачы, складзенай загадчыкам губернскай агранамічнай дапамогі ў Гарадзенскай губерні Барысам Авенарыюсам, першая спроба арганізацыі сельскагаспадарчых мерапрыемстваў адбылася ў 1909 г. і была не вельмі ўдалай. У першую чаргу, так здарылася па прычыне несвоечасовага фінансавання. Гарадзенскі камітэт па землеўладкавальных справах вылучыў на ўсе агранамічныя мерапрыемствы 19500 рублёў, але з-за позняга “*адкрыцця крэдыту*” большая частка сумы (12 171 руб. 31 кап.) не была выкарыстана. У выніку, фактычна была сарвана запланаваная праграма па аказанні дапамогі адзінаасобным гаспадарам, паколькі “*знайсці падыходзячых аграномаў удалося вельмі позна, і адсутнасць такіх на працягу амаль усяго летняга перыяду зрабіла немагчымым ажыццяўленне большай часткі мерапрыемстваў, прадугледжаных Агранамічнай Нарадай*” [1]. З 7328 руб. 69 кап. выдаткаваных грошай на ўтрыманне трох аграномаў пайшло



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

2318 руб. 40 кап., пры гэтым нанятыя яны былі не адразу, а толькі ў другой палове года (адзін – у ліпені, адзін – у верасні і адзін – у кастрычніку) [1]. Першы з іх загадваў дапамогай у Гарадзенскім і Сакольскім паветах, другі – у Бельскім і Беластоцкім, трэці – у Брэсцкім і Кобрынскім паветах. Іншыя паветы губерні – Пружанскі, Ваўкавыскі і Слонімскі засталіся ўвогуле без адказнага за іх агранамічнага персаналу. Такі стан рэчаў дазволіў Барысу Авенарыюсу канстатаваць, што трох аграномаў на губерню недастатковa і агульную іх колькасць належала падвоіць [1].

Гарадзенская губерня даволі актыўна ўключылася ў сталыпінскія пераўтварэнні: дынаміка зрухаў была аптымістычнай, як і спадзяванні мясцовага чынавенства на сталае фінансаванне аградапамогі. Паводле звестак Губернскай Прысутнасці, колькасць хутароў у губерні на 1 студзеня 1910 г. дасягнула 4332, а згодна з прагнозам, гэта лічба мела павялічыцца ажно ўдвая на працягу года. Гэта абуджала надзею мясцовых губернскіх улад адносна таго, што можна было чакаць росту памераў скарбовай дапамогі, якая на 1910 г. складала каля 40 000 рублёў [1]. Адным з ключавых пытанняў сельскагаспадарчай дапамогі было кадравае забеспячэнне арганізаваных структур. Так, на 1910 г. планавалася, што губерню мэтазгодна падзяліць на шэсць участкаў, якія пераважна не супадалі з межамі паветаў (Гарадзенскі, Беластоцка-Сакольскі, Бельскі (паўночная частка Брэсцкага пав.), Кобрынскі (паўднёвая частка Брэсцкага пав.), Пружанскі (паўднёвая частка Слонімскага пав.), Ваўкавыскі (паўночная частка Слонімскага пав.). Агульнае кіраванне агранамічнай справай ускладалася на Губернскага агранома, які адначасова меў загадваць гарадзенскай павятовай аградапамогай, кіраваць арганізацыяй узорных паказальных гаспадарак і займацца справаводствам Губернскай агранамічнай нарады. На яго ўтрыманне вылучалі 3000 рублёў (2400 утрыманне і 600 камандыровачныя). На чале кожнага агранамічнага ўчастка належала паставіць агранома з жалаваннем 1500 руб. (плюс 300 раз'ездных і суткавых 360 руб. па (3 руб. на дзень) = 2160 руб). Участковым аграномам мелі падпарадкоўвацца памочнікі з сярэдняй ці ніжэйшай сельскагаспадарчай адукацыяй ці спецыялісты ў нейкай галіне (маслароб, садавод, пчаляр, агароднік і г.д.). Іх паслугі ацэньваліся у 600 руб. жалавання і 120 руб. раз'ездных. Сталыя памочнікі маглі быць замененыя практыкантамі – вучнямі сельскагаспадарчых вучэлень, але толькі на час палявых работ (на шэсць месяцаў па 50 руб. – 300 руб.). Сумарна на персанал у 1910 г. прапаноўвалася "*прасіць крэдыт*" у памеры 18 120 руб., што ні многа ні мала складала амаль палову ўсёй сумы (да 45 000 руб.), якую ўвогуле вылучалі на аградапамогу, якая, акрамя іншага, уключала арганізацыю паказальных гаспадарак, пракатных станцый, закупку племяннoй



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

жывёлы, насення, саджанцаў, уладкаванне маслабоен, чытанне лекцый, набыццё наглядных матэрыялаў і ішн. [1].

Праект 1910 г. быў толькі стартавым у развіцці структуры Гарадзенскай асаблівай агранамічнай нарады (ГААН), якая на працягу некалькіх гадоў сфармавала паўнавартасны штат супрацоўнікаў. Звесткі пра склад сельскагаспадарчага персаналу губерні захаваліся дзякуючы статыстычна-даведачным матэрыялам, якія збіраліся дэпартаментам земляробства Галоўнай Управы Землеўпарадкавання і Землекарыстання (ГУЗіЗ) для выдання даведніка "Мясцовы агранамічны персанал, які знаходзіцца на ўрадавай і грамадзянскай службе" [2]. На загад з ГУЗіЗ праз Гарадзенскую губернскую землеўладкавальную камісію ў тэрміновым парадку кіраўніку справаводства ГААН было даручана на працягу снежня 1912 г. і да 5 студзеня 1913 г. сабраць і прадставіць неабходныя звесткі [2]. Але самае цікавае, што і ў 1912 г., і ў 1913 г. кіраўніцтва ГУЗіЗ так і не здолела своечасова сабраць ўсю інфармацыю, і выданне даведніка адкладвалася [2]. Як бы там ні было, але ў святле сабраных для справаздачы дадзеных структура агранамічнага персаналу Гарадзенскай губерні на 1 студзеня 1913 г. мела наступны выгляд:

Губернскі аграном: Павел Фёдаравіч Мінкоў (меў вышэйшую адукацыю, якую атрымаў у 1903 г.; адказваў за ўсю губерню, меў месца жыхарства ў г. Гродна). Служыў у губерні 3 гады (лічба выпраўлена алоўкам на 10), пасаду займаў тры гады (лічба выпраўлена алоўкам на 1). Утрыманне яго сладала 3000 рублёў (2400 выкрэслена), на раз'езды 1200 (600 выкрэслена) [2].

Загадчык агранамічнага справаводства ў ГААН. Барыс Георгіевіч Авенарыюс (меў вышэйшую адукацыю, якую атрымаў у 1907 г.). Служыў у губерні чатыры гады, а на пасадзе тры [2].

Павятовыя аграномы Гарадзенскай губерні. Колькасць іх на 1913 г. складала дзевяць чалавек. Фактычнае ўтрыманне – 1800 руб. і 600 руб. на раз'езды. Усе аграномы мелі вышэйшую адукацыю, але большасць толькі нядаўна яе атрымала. Вопыт працы ў губерні ва ўсіх быў мінімальны [2].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ